TV@R

Юлія ШПІЛЕЎСКАЯ:

«ВОПЫТ У ВАЧАХ І ВЕДАННЕ ЖЫЦЦЯ — НЕ ЗАГРЫМІРУЕШ»

Актрыса Купалаўскага тэатра, яна не адмаўляе акцёрства і ў жыцці, але выступае за шчырасць і натуральнасць у тэлевізійным эфіры. Любіць парадак і ні хвіліны не сядзіць без руху. Умее чакаць сваіх «роляў» і быць пры неабходнасці аскетам. На эксперыменты адважваецца, але пры ўмове, што гэта не супярэчыць яе ўнутранай сутнасці. Вядучая праграмы «Раніца. Студыя добрага настрою» на Сталічным тэлебачанні Юлія Шпілеўская сёння марыць пра здымкі ў еўрапейскім кіно, вяртанне да мюзікла, перавыхоўвае сябе ў ролі мамы і па-ранейшаму ўспрымае сваю працу як любімае хобі...

— На праграме «Раніца. Студыя добрага настрою» вы з моманту яе заснавання. Як змянілася яна за дзесяцігоддзе?

— Сама, дарэчы, успамінала нядаўна, як доўга ўжо выходзіць праграма, бо не вельмі добра памятаю пачатак. Тады не фіксавала нейкія даты для сябе: прыйшла — і пачалі з камандай працаваць. Безумоўна, праект змяніўся. І найперш таму, што змяніліся тыя, хто яго стварае. Я асабіста лічу гэта станоўчай пераменай. Калі пачыналі ў стылі «спартыўных кофтачак» і больш арыентаваліся на моладзь, то сёння мы ўжо выходзім у эфір як сталыя людзі. Я маю на ўвазе вопыт, погляды на жыццё. І праграма цяпер разлічана на шырокае кола гледачоў — не толькі хатніх гаспадынь і студэнтаў альбо жанчын, якія даглядаюць дзяцей, але і на дзелавых людзей. Зразумела, трэба ісці ў нагу з часам, аднак важна не забываць, што праграма павінна быць забаўляльнай і пазнавальнай. На перамены ўплывае і прыток новых кадраў на праекце. Мы ўвесь час знаходзімся ў пошуку нечага новага, крэатыўнага. Бывае, і без спрэчак не абыходзіцца. Але гэта ўсё дае рух тэлебачанню...

Нават чакаючы нараджэння сына, я да дзявятага месяца была ў кадры і не бачыла ў гэтым перашкоды.

За гады існавання праграмы нарадзілася не адно дзіця. У мяне з'явіўся сын, у Жэні Пастуховай (наш рэдактар, сцэнарыст) — ужо двое дзяцей. Таму праграма — гэта адлюстраванне нашага жыцця, наш спадарожнік у ім.

— Чым, на вашу думку, абумоўлена папулярнасць ранішніх шоу?

— Мне здаецца, тут не варта шукаць нейкага канкрэтнага адказу. Сучасны чалавек запраграмаваны на тое, што, прачынаючыся, ён нешта ўключае — тэлевізар, радыё ці проста музыку. І калі табе з раніцы прапаноўваюць паглядзець на цікавых людзей, сюжэты, то чаму не пабыць гледачу ў добрай кампаніі? Раніца — гэта жыла горада, з яе ўсё пачынаецца. Мы ствараем людзям настрой на дзень.

— Не адчуваеце звыкласці да працы ў пэўным фармаце?

— Аднастайнасці не бывае. За час існавання праекта змяняліся праграмныя дырэктары, змяняліся падыходы, і, такім чынам, мы імкнёмся прыўнесці ў праграму новыя фарбы. Добра разумею, што як актрыса магу ўвасобіць любы вобраз, але як тэлевядучая я павінна быць арганічнай і шчырай. Таму паўстае пытанне: ці трэба здзіўляць эксперыментамі там, дзе людзі чакаюць сустрэць нармальнага чалавека? На ролі пры жаданні можна ў тэатр прыйсці паглядзець. У мяне доўгі час быў партнёрам Сяргей Чуб, але я таксама адпрацавала ў кадры з усімі, хто з'яўляўся ў нашай праграме. І тут кожны раз трэба падладзіцца пад чалавека, каб паміж вамі быў дыялог, а не спаборніцтва ў стылі «рабі, як я». У пары павінна існаваць узаемапаразуменне. Фармат, па вялікім рахунку, — гэта ўмоўнасць, бо ўсё роўна пры стварэнні праграмы мы адштурхоўваемся ад пэўных мэт: калі хочаш звярнуць увагу моладзі, то і ў скокі пусцішся, а для дзелавых людзей спатрэбіцца біржавая зводка... З гасцямі ж мы прытрымліваемся пазіцыі не выцягваць інфармацыю каверзнымі пытаннямі, бо важна, каб чалавек у нас адчуваў сябе, як дома. Быць цікавымі для ўсіх — задача не з простых.

— Пераезд у новую студыю пашырыў прастору для творчасці?

— Шчыра кажучы, у нас вельмі спантаннае тэлебачанне і пра перамены мы часам дазнаёмся вельмі нечакана. І ў такіх момантах ёсць эфект шокавай тэрапіі і адрэналін, ад якіх хочацца не збаўляць жыццёвага тэмпу. Зараз асвойваемся з новай студыяй. Той факт, што яна новая і вялікая, вельмі радуе, бо прысутнічае пачуццё дабрабыту. Цяпер у нас ёсць паўнавартаснае месца для працы, з'явілася магчымасць запрашаць ансамблі, паказваць цыркавыя нумары і так далей. Праект стаў маштабным, якасным, але пакуль перамены ўваходзяць у сваю плынь. Даводзіцца карэкціраваць сваё жыццё ў адпаведнасці з гэтым. А ў цэлым такія перамены — прыкмета росту, як для «Раніцы...», так і для каманды.

— Да прыходу на тэлебачанне якой уяўлялі сабе працу ў гэтай сферы?

— Асабліва не задумвалася пра гэта, бо ў мяне не было мары стаць тэлевядучай. Для мяне праца на тэлебачанні — магчымасць паспрабаваць сябе, і я разглядала яе як адзін са складнікаў акцёрскай прафесіі. Я па першай адукацыі яшчэ і псіхолаг, што верагодна таксама падмацоўвае жаданне размаўляць з некім, дазнавацца пра нешта. Складанасці былі напачатку, калі трэба было разабрацца з працэсам, тэхнічнымі нюансамі. Цяпер жа разумею: самае цяжкае — утрымаць патрэбны градус настрою ў эфіры. Не зважаючы на самыя непрадказальныя абставіны, трэба не губляць тэмпу. Усё прыходзіць з вопытам.

— Як вам падаецца, стаць тэлевядучым можа кожны?

— Любы чалавек, які гатовы размаўляць. Я супраць розных канонаў, быццам твар павінен адпавядаць нейкім лякалам, быць сіметрычным, вядучы мусіць бездакорна выгаворваць усе гукі і гэтак далей. Ведаю шмат людзей, якія нават не працуюць на тэлебачанні, але маюць такую цікавінку, харызматычнасць, што яны запамінаюцца. Галоўнае, калі трапляе чалавек на тэлебачанне, правільна падабраць фармат, праграму. Ёсць нямала прыгожых твараў, але гэтага недастаткова. Магчыма, дыктару навін не абавязкова быць яркім, каб не адцягваць увагі ад інфармацыі, але ў той жа час часта ад «твару на экране» залежыць рэйтынг. Таму было б жаданне працаваць — тады ўсё атрымаецца. Я не сказала б, што прафесія тэлевядучай патрабуе нечага неверагоднага. Дастаткова ўмець яркa сябе падаць. Няма нічога немагчымага, і таленавітых людзей у нас многа.

— Канкурэнцыя за месца ў кадры на тэлебачанні адчуваецца?

— Напэўна, недзе яна і існуе, але я яе не адчуваю... Бо не заўсёды «хачу» супадае з «магу». Узяць наш канал — здаецца, там усе дзяўчаты на падбор. І працы ўсім хапае: у каго свая рубрыка, а ў іншых — і праграма. Аднак варта памятаць, што незаменных няма. Я не выключаю, што заўтра з'явіцца нехта, хто пасуне мяне ў кадры. І такая з'ява нармальная. У тэатры я, магчыма, **А наогул я звычайны чалавек, які раніцай вядзе сына ў дзіцячы садок, без макіяжу і прычоскі, прыбірае ў кватэры, часам хварэе. У штодзённых клопатах і іх разнастайнасці няма калі сачыць за «зорнасцю».** саступіла нейкую мяжу, калі перастала іграць Паўлінку. Бо існуюць для ўсяго свае рамкі, і, нягледзячы на тое, што я ў добрай форме, але вопыт у вачах і веданне жыцця не загрыміруеш. Я з вялікім задавальненнем перайшла на ролі іншага характару. А ў тэатр прыйшлі маладыя дзяўчаты — няхай іграюць! Тое ж і ў праграме. Яна пакуль што расце разам са мной. Калі аднойчы мне скажуць, што мы будзем рабіць яе ў нейкім падлеткавым стылі, напрыклад, то хутчэй за ўсё, я задумаюся пра свой удзел у яе стварэнні. І не з-за адсутнасці інтарэсу, а таму што трэба будзе іграць. А паняцце шчырасці для нашай праграмы ляжыць у аснове. Нават чакаючы нараджэння сына, я да дзявятага месяца была ў кадры і не бачыла ў гэтым перашкоды. Думаю, калі глядач бачыць у кадры жывога чалавека, то гэта прыцягвае. Асноўная задача тэлебачання — размаўляць з аўдыторыяй з пазіцыі звычайнага чалавека, а не нейкага бажаства.

— Вы актрыса і тэлевядучая. Адчуваеце ўласную папулярнасць?

— Неяк задавала сабе такое пытанне. Праўда, крыху ў іншым кантэксце. Мне здаецца, час, калі артыстаў чакалі з букетам кветак каля тэатра, даўно ў мінулым. Альбо такое яшчэ здараецца з «зоркамі» Галівуда ці артыстамі эстрады. Як тэлевядучую мяне магчыма нехта і пазнае, але (нямай прабачыць мне тэлебачанне) большае задавальненне я атрымліваю, калі мяне ведаюць па тэатральных ролях. Бо тэлебачанне глядзяць многія, а з тэатрам сітуацыя зусім іншая... А наогул я звычайны чалавек, які раніцай вядзе сына ў дзіцячы садок, без макіяжу і прычоскі, прыбірае ў кватэры, часам хварэе. У штодзённых клопатах і іх разнастайнасці няма калі сачыць за «зорнасцю». І ўвогуле мяне цікавіць не ўласная папулярнасць, а, напрыклад, ці здолею я пакарыць гэты горны схіл. Пазнаюць мяне — значыць, не дарэмна працую, бо зваротная сувязь з'яўляецца сведчаннем разумення іншымі таго, што ты робіш. Па вялікім рахунку, мы ўсе працуем дзеля саміх сябе. Не магу пахваліцца нейкім талентам, каб умомант прачнуцца знакамітай. Мой выпадак — гэта сітуацыя, калі час працуе на мяне.

— Калі прыйшлося б выбіраць паміж тэатрам і тэлебачаннем...

— Бываюць розныя сітуацыі. Здараецца, нагрузкі на тэлебачанні супадаюць з тэатральнымі, тады не заўсёды проста. Даводзіцца ўсюды дамаўляцца. Вельмі не люблю стан стрэсу, калі не ведаеш, як і што вырашыцца. Часам проста пускаеш усё на самацёк... Я адданая тэатру, і ён для мяне ў прыярытэце — гэта дом, у якім я пачынала свой шлях. Не буду ўтойваць, у фінансавым плане выгадней працаваць на тэлебачанні, бо, як вядома, добры артыст павінен быць галодным *(выразна ўсміхаецца. — Аўт.)*... У нас добрае кіраўніцтва, таму, мне здаецца, сёння ніхто не будзе ставіць чалавека перад такім выбарам. Хіба што самому захочацца змен. Артыст — мастак, якому патрэбна жывіцца з розных бакоў, тады ёсць рух наперад.

— Вы дазваляеце сабе ў звычайным жыцці быць актрысай?

— Безумоўна. Кожны з нас акцёр у пэўнай ступені ў залежнасці ад жыццёвых абставін, проста мы не задумваемся пра тое! З аднымі людзьмі мы размаўляем так, а з другімі — зусім па-іншаму. Жыццё — гэта тэатр па сваёй будове. Нам усім хочацца сябе праявіць!

Алена ДРАПКО.

■ Неасабісты суб'ектыў

ТРЫЦЦАЦЬ ШЭСЦЬ І АДЗІН СЮЖЭТ

Па якім з іх пісаць кнігу ўласнага лёсу, кожны вырашае сам

Нядаўна на вочы трапілася адно надзвычай цікавае даследаванне «Les 36 situations dramatiques» («Трыццаць шэсць драматычных сітуацый»). Яго ў далёкім 1895 годзе напісаў вядомы французскі тэатразнаўца Жорж Пальці. Пералік тых сітуацый, павінна вам сказаць, надзвычай цікавы, асабліва калі ўлічыць, што сам аўтар разглядаў гэты спіс як аснову ўсёй сусветнай драматургіі: маўляў, якім бы таленавітым ні быў пісьменнік і як бы ён ні стараўся, усё роўна сюжэт яго твора «ўпрэцца» ў адну або некалькі прыведзеных сітуацый. За тыя больш чым сто гадоў, што гэтая тэорыя існуе, ніхто з ахвотных (а было, іх, мяркую нямала) не змог гэты спіс перайначыць або дапоўніць. Больш за тое — некаторыя даследчыкі чалавечай натуры і сутнасці сцвярджаюць, што француз, сам аб гэтым не здагадваючыся, стварыў тэорыю, згодна з якой развіваецца не толькі драматургія, літаратура ўвогуле, але і ўсё наша жыццё. Што ж, калі ўспомніць Шэкспіра з яго славутым: «Жыццё — тэатр», усё супадае...

Не верыце? Праверце на сабе. Вось яны, тыя трыццаць шэсць сцэнарыяў жыццёвых сітуацый: мальба, выратаванне, помста за нейкае злачынства, помста блізкаму за блізкага, зацкаванне, раптоўнае няшчасце, ахвяра каго-небудзь, бунт, адважная спроба, выкраданне, загадка, дасягненне, нянавісць паміж блізкімі, саперніцтва паміж блізкімі, адзюльтэр (сужэнцкая здрада), што цягне за сабой забойства, вар'яцтва, фатальная неасцярожнасць, інцэст незнарок, забойства блізкага незнарок, самаахвяраванне ў імя ідэала, самаахвяраванне дзеля блізкіх, ахвяраванне ўсім дзеля страсці, ахвяра блізкім дзеля абавязку, саперніцтва няроўных, адзюльтэр (проста так, без забойства), злачынства дзеля кахання, ганьбаванне любімай істоты, кахання з перашкодамі, славалюбства, барацьба супраць бога, беспадстаўная рэўнасць або зайздасць, судовая памылка, пакуты сумнення, страчанае і зноў знойдзенае, страта блізкіх...

Такая вось драматургія. Нічога новага, усё па тым ці іншым сцэнарыі, якія часам надзвычай адмыслова (але зноў жа — у аснове ўсё тыя ж трыццаць шэсць сюжэтаў) закручвае для кожнага з нас лёс. Толькі вось, калі казаць пра жыццё, а не пра тэатр, аднаго сюжэта (бадай, не памылюся, калі скажу — галоўнага) у гэтым пераліку ўсё ж не хапае. Выбар. З ім мы сутыкаемся штодня, нават у самых банальных сітуацыях, нават не заўважаючы гэтага. Але менавіта ад яго нярэдка залежыць, па якім са сцэнарыяў будзе далей развівацца п'еса нашага жыцця.

Мне нядаўна расказалі проста неверагодную гісторыю пра гэты самы выбар. А заадно і пра здраду, і пра ганьбаванне любімай істоты, і пра пакуты сумнення. Жыла адна сям'я, вялікая і дружная. Бацька, маці, тры сыны, дзве дачкі. Усе ўдалыя, працавітыя, жылі ў дабрабыце, ва ўзаемнай павазе і падтрымцы. Да таго часу, пакуль бацькі былі маладыя і здаровыя. Калі ж бацькі не стала, а маці пасівела і пачала хадзіць па вуліцы з кіёчкам, дзеці і шматлікія ўнукі пакрысе пачалі дарогу да яе хаты забываць. А калі маці зусім занемагла і трэба было яе даглядаць, на сямейным савеце пачалі яе... «дзяліць». І ў кожнага знайшлася не адна, а дзесяць вельмі важкіх прычын, каб бабулю да сябе не ўзяць. Зіма летась выдалася надзвычай халодная, бабка ў вялікай хаце неяк ківалася адна, а калі трываць ужо не стала моцы, папрасілася ў мясцовую бальніцу на сацыяльны ложак. Там і памерла ў першы дзень вясны, так і не дачакаўшыся, каб хто-небудзь са шматлікай радні адчыніў у палату дзверы. Хаваючы слёзы, тлумачыла медсёстрам: маўляў, холадна, дарогі пазамятала, куды ж мае дзеткі ў такую далеч (са сталіцы пад Баранавічы) паедуць...

Хату, адпісаную бабкай на ўсіх, дзеці хутка, як толькі ўступілі ў правы спадчыны, прадалі, грошы падзялілі і раз'ехаліся. Новы гаспадар пачаў рабіць у ёй рамонт, палез на гарышча і пад струхнелай саломай знайшоў два пацямнелыя ад часу абразы. Аказалася — ці не сямнаццатага стагоддзя. Карацей, купіў у яго тыя абразы нехта з нашых калекцыянераў, прычым заплаціў такія грошы, што мужык той ужо колькі месяцаў на новенькай дарагой машыне ездзіць.

Але на гэтым гісторыя не скончылася. Сям'я, што маці паміраць пакінула, зноў разам сабралася: высвятлялі, каму ў галаву першаму ідэя прыйшла бацькоўскую хату, а разам з ёй і тыя каштоўныя абразы, хуценька прадаць. Спрачаліся-сварыліся, адзін брат другога штурхнуў, той нябожа паваліўся — скроняй аб парог. Пакуль жанкі галасілі і хуткую з міліцыяй выклікалі, забойца знайшоў вяроўку і замкнуўся ў кладоўцы... Пахавалі іх побач: браты ўсё-такі. А праз тыдзень дачка аднаго з іх нарадзіла мёртвае дзіця. Урачы сказалі: стрэс ад страты роднага чалавека. Цяпер у яе, кажуць, дэпрэсія, лечыцца ў псіхіятрычным аддзяленні. А муж яе з гора пачаў піць, сеў п'яны за руль, пакалечыў чалавека і цяпер знаходзіцца пад следствам... Карацей, кажуць людзі, увесь род на звод пайшоў...

А ўсяго б гэтага ланцужка няшчасцяў магло б і не быць, калі б... Спадзяюся, вы самі разумееце. Неба дае нам свабоду выбару, а пасля — па справах і ўчынках нашых.

Такая вось драматургія...

Алена ЛЯЎКОВІЧ

ЗА МІЛЫХ МАМ

Акурат 8 Сакавіка тэлеканал «Беларусь 2» зробіць падарунак гледачам, дакладней, глядачкам — канцэртную праграму «Песні для мамы». Будуць віншаваць папулярныя артысты, любімыя рознымі пакаленнямі, — прычым выключна мужчыны: Аляксандр Ціхановіч, Анатоль Ярмоленка, Валерый Дайнека, Аляксандр Яфрэмаў, Аляксандр Саладуха, Пётр Ялфімаў, вакальны гурт «Чысты голас», Уладзімір Пугач, Саша Нема, Георгій Волчак, Уладзімір Ухцінскі, Віктар Пшанічны, гурты «Дразды» і «Атлантыка» ды іншыя.

Самыя прыгожыя песні з рэпертуару беларускіх выканаўцаў і музычныя прысвячэнні ў розных стылях (ад року да оперы), сольна, калектыўна і нават агульным вялізным хорам прагучаць для любімых матуль, дачок, каханых і дарагіх жанчын. А «дырыжыруюць» святам у якасці вядучых канцэрта народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка, усюдыісны спявак Тэа (ён жа Юрый Вашчук) і тэлевядучы, прадзюсар Алег Ціткоў.



Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 САКАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 0.00 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.05 Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
11.45 Нашы.
12.10 «Зорнае жыццё». «Не нарадзіся прыгожай».
13.10 Меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Баявік «Анёлы Чарлі».
17.15 БеларусьLIFE.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
19.55 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Вострaў непатрэбных людзей».
23.45 Актуальнае інтэрв'ю.
0.35 Дзень спорту.
0.45 Баявік «Паркер».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 10.05, 21.50 Тэлебарометр.
9.05, 17.55 Серыял «Дзень гневу».
10.40 Серыял «Ластаўчына гняздо».
12.45 Камедыя «Чаго чакаць, калі чакаеш дзіця».
14.50 «Песні для мамы». Святочны канцэрт.
17.05 «Перазагрузка». Моладзевае ток-шоу.
18.55 Серыял «У кожнага свая вайна».
21.45 КЕНО.
21.55 Серыял «Універ. Новая абшчага».
23.30 Серыял «Людзі Шпака».
0.20 «Перазагрузка». Моладзевае ток-шоу.

БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.45, 15.00, 16.55, 21.05, 0.35 «Калейдаскоп».
8.05, 12.50, 15.05, 17.05, 0.45 «Энцыклапедыя беларускага спорту». Біятлон.
8.15 «Канцэрт Бетховена». Маст. фільм.
9.20, 22.05 «Дыя@блог». «Пра мову».
9.50, 21.15 Серыял «Мегрэ».
10.45, 0.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Яўгена Цікоцкага.
11.15 «Шлягеры назаўсёды». Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Валянціна Дудкевіча.
13.00 «Снягурка». Маст. фільм.
14.30 «Карані». Паэты Кішынёва.
15.15 «Масква—Мінск. Кінатранзіт». «Уладзімір Гасцюхін. Узыходжанне». Дак. фільм.
15.45 «Наша спадчына». Жалудоцкі палац.
16.10 «Цуды прыроды». Арктыка. Канада.
16.45 «Сямейны альбом». Рыгор Шакулаў.
17.15 «Добры дзень, мае дарагія!». Дак. фільм.
17.45 «Святая Рыма». Дак. фільм.
18.25 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Маст. фільм.
20.00 Серыял «Герой нашага часу».
20.45 Калыханка.
22.30 «Батанічны сад». Маст. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

6.25—12.25, 20.55—0.55 Тэніс. Турнір WTA. Індзіян-Уэлс.
12.25 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Хімкі» — «Цмокі-Мінск».
14.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Кардыф» — «Фулхэм».
15.50 Гандбол. SEHA-ліга. «Металург» (Македонія) — БКГ імя Мяшкова (Беларусь).
17.15 Авертайм.
17.45 Хакей. КХЛ. Плэй-оф.
20.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Маст. фільм «Трынтрава».
13.10 Камедыя «Сцеражыся аўтамабіля».
14.55 «Ісціна дзесьці побач».
15.15, 16.15 Камедыя «Пакроўскія вароты».
18.20 «Адваротны адлік». «1863-і. Пад ударам імперыі». Фільм першы.
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Пазіцыя».
22.05 «Гала-канцэрт выпускнікоў «Акадэміі талентаў».
23.50 Трылер «Лэдзі-ястраб».
2.05 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае снеданне».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.20 «Такі лёс».
12.05 «ХороШоу». Фінал. «Пра што спяваюць жанчыны».
13.50 «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «PlayBack» супраць «Gentle Beat».
15.00 «Іншая краіна». «Бусел насарогу — таварыш?».
16.20 «Наша справа».
16.50 «Следакі».
18.30 «Ежа багоў».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Іншы мужчына».
22.00 «Глядзець усім!».
23.00 «Ваенная тайна».

МІР

5.00 Маст. фільм «Не пакідай...».
7.35 М/ф.
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10, 23.40 Маст. фільм «Жорсткі раманс».
11.40, 15.30 Серыял «Жанчына хоча ведаць».
17.40, 18.45 Серыял «Я сышчык».
2.10 Маст. фільм «Залезь на Месяц».
3.45 Дак. фільм «З нагоды. Камчатка. Жыццё на вулканах».

БЕЛАРУСЬ РТР — РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.25 Маст. фільм «Маладыя».
9.15 Надвор'е на тыдзень.
9.20 Маст. фільм «Яблычны спас».
12.50, 14.15 Маст. фільм «Нявеста майго жаніха».
13.50, 17.20, 19.50, 0.15 Навіны — Беларусь.
14.00, 20.00 Весткі.
15.15 Маст. фільм «Я яго зляпіла».
17.30 «Бабы, наперад!».
20.25 «Усе зоркі для каханай». Святочны канцэрт.
22.20 Серыял «Турэцкі транзіт».
0.25 «Нядзельны вечар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.30 «Таямнічая Расія».
7.20 «Іх норавы».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.15 «Цуд тэхнікі».
8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.55 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.20 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 «Справа ўрачоў».
15.15 «Пракурорская праверка».
17.30 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
18.25 «Выратавальнікі».
19.25 Серыял «Марскія д'яблы».
21.10 Маст. фільм «Адзіночка».
23.10 «Прысуджаныя. Пастка для групы «Альфа».
0.05 Серыял «Дзікі».

8 КАНАЛ

7.00, 13.05, 19.10, 20.55, 0.05 «Надвор'е».
7.05 М/ф.
8.20 Серыял «Ведзьмы з Іст-Энда».
10.40 «Сінематограф». Маст. фільм «Красная плошча».
13.10 Камедыя «Рыбка па імені Ванда».
15.00 Серыял «Дамскае шчасце».
16.05 Мультпарад.
16.30 «Мой любімы гадавалец».
17.00 Серыял «Тэорыя хлусні».
17.50 Серыял «Служба навін».
19.15 Серыял «Тайныя сувязі».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Трылер «Аперацыя «Арго».
23.15 Серыял «Горад мары».

ВТБ

6.00, 0.30 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.45, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Святлафор».
10.00 «Яда па правілах і без».
11.00 «Жонкі алігархаў».
12.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
13.00, 23.20 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
16.00 Фэнтэзі «Міф».
20.00 Серыял «Кухня».
21.10 Камедыя «Парыж любой цаной».

КУЛЬТУРА

6.00 «Ёўраньюс».
9.00 «Прафесія — Кіа». Дак. фільм.
9.35 «Яна вас кахае?!». Маст. фільм.
10.55 «Астравы». Георгій Віцын.
11.35 Пернікавы домік. «Так, будзе святло!».
12.05 «Прыгоды кацяняці і яго сяброў». М/ф.
12.50 «У каралеўстве раслін». Дак. серыял.
13.45 «Красуйся, горад Пятроў!». Царскае Сяло.
14.10 «Бярозка» — жыццё маё». Юбілейны канцэрт у гонар Міры Кальцовай.
15.30 Да юбілею кінастудыі. «Масфільм». 90 крокаў».
15.45 «Іван Грозны». Маст. фільм.
18.40 «Больш, чым каханне». Людміла Цалікоўская.
19.25 «Рамантыка раманса». Група «Кватро».
20.20 Спектакль Тэатра Антона Чэхава «Смешаныя пачуцці».
22.00 «Пастамент прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай».
22.30 Кіно на ўсе часы. «На ўсход ад раю». Маст. фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «СевАлогія»: «Легенда рок-н-рола». 2005 год.
5.55 «Тэатральныя сустрэчы». 8 сакавіка 1978 года.
7.25 «Прызнанне ў каханні». Святочны канцэрт. 8 сакавіка 1988 года.
9.00 «Ліка». Тэлеспектакль. 1978 год.
10.30 «З каханнем да жанчыны». Вершы пра каханне. 1981 год.
11.00 «Тэатр + TV». 1993 год.
12.00, 3.00 «Колба часу».
13.00 «Шынок 13 крэслаў» «8 Сакавіка». 1978 год.
14.00 «Блакітны агеньчык». Святочны выпуск. 1966 год.
15.50 «У гасцях у часопіса «Огонек». 1986 год.
17.00 «Ранічкаю». «Рэйс-9.10. Па слядах Нільса». 1989 год.
18.00 «Херлуф Бідструп у Маскве». Дак. фільм.
18.30 «Спадары Глембаі». 1 частка. Фільм-спектакль. 1979 год.
20.00, 2.00 «Мінулы час».
21.00 «Народжаныя ў СССР».
22.00 «Тбілісі-80». Дак. фільм.
23.00 «Міжнародная панарама». 1978 год.
23.40 «Ранішняя пошта». 1988 год.
0.15 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
0.50 «Дробязі жыцця». Маст. фільм.
4.00 «Кінапанарама». 1992 год.

EUROSPORT

10.30, 15.30 Веласпорт. Парыж—Ніца.
11.30, 3.00 Скачкі з трамплінa. Кубак свету.
12.30 Біятлон. Кубак свету.
13.30 Лёгкая атлетыка. Кубак свету.
18.00, 20.30, 0.50 Футбол. Кубак Альгарве.
19.45, 2.15 Футбол. Еўрагалы.
22.30 Вось гэта дзіва!!!
23.00 Рэслінг.
0.30 Конны спорт.
0.40 Спорт і Ко.
0.45 Экамарафон Шэл.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 13.00, 16.05, 21.00, 2.20 Серыял «Камп'ютаршчыкі».
6.15 Камедыя «Дзейнічай, сястра!».
8.50 Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?».
11.15 Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
14.10 Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
17.20 Камедыя «Трэзор».
18.50, 21.50, 23.50, 1.45, 3.10, 4.40 «Камедыянты. Лепшае».
19.20 Камедыя «Мой лепшы сябар».
22.10 Камедыя «Банда няўдачнікаў».
0.10 Камедыя «А як жа Боб?».
3.25 Камедыя «Нічога святога».

ТБ3

6.00 М/ф.
8.05 «Сардэчна запрашаем дамоў!».
8.45, 18.30, 3.00 «Забаронены каханне». Серыял.
10.15 «Паненка і кулінар».
10.45, 17.00 «Паралельны свет». Дак. серыял.
11.45, 16.00 «Варажбітка». Дак. серыял.
12.45, 18.00 «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
13.10 «Жонка. Гісторыя кахання». Алена Чайкоўская.
14.30 «Сто пытанняў дарославу». Павел Чухрай.
15.15, 0.00, 5.20 «Звышнатуральнае». Серыял.
20.15 «Леднікаў». Серыял.
21.10, 4.30 «Брыгада». Серыял. Заключная серыя.
22.10 «Змова». Маст. фільм.
0.45 «Абрынутыя нябёсы». Серыял.
1.30 «Часова даступны». Ігар Нікалаеў.
2.20 «Без падману».

ТБ1000

5.00 Драма «Успаміны няўдачніка».
7.00 Драма «Забытыя жаданні».
9.00 Драма «Маладая Віктарыя».
11.00 Драма «Дабранач і ўдачы».
12.45 Фэнтэзі «Прыцемкі. Сага. Зацьменне».
14.55 Камедыя «Трынаццаць сяброў Оўшэна».
17.05 Драма «Забароненае каханне».
19.00 Трылер «Тормаз».
20.40 Баявік «Воін».
23.05 Баявік «Даміно».
1.20 Трагікамедыя «Дзверы ў падлозе».
3.10 Драма «Абуджаючы мерцвякоў».

РУССКОЕ КИНО ТВ1000 — ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Драма «Лісты да Эльзы».
8.05 Драма «Слон».
10.00 Камедыя «Ёлкі 2».
12.00 Драма «Салодкая жанчына».
13.50 Драма «Дзяўчына і смерць».
16.00 Драма «Адмірал».
18.10 Маст. фільм «1812: Уланская балада».
20.00 Драма «Чужыя».
22.00 Драма «Ікона сезона».
0.00 Дэтэктыў «Хто я?».
2.00 Драма «Русалка».
4.00 Камедыя «Прыгоды жоўтага чамаданчыка».

NATIONAL GEOGRAPHIC CHANNEL — NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Сканеры старажытнага свету.
6.00 Цар кракадзілаў.
7.00, 13.00 Экстрэмальнае падарожжа.
10.00 Машыны: разабраць і прадаць.
11.00 Цяжкае золата Аляскі.
12.00 Скарбашукальнікі.
15.00 Супердрапежнікі.
16.00 Злавіць сома.
17.00, 2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
18.00 Гульні розуму.
19.00, 22.00, 0.00, 3.00 Космас.
21.00, 1.00, 4.00 Сканеры старажытнага свету.
23.00 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY CHANNEL — DISCOVERY

7.00 Майстэрня «Фантом Уоркс».
7.50, 12.20, 22.00 Сысці ад пагоні.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Скарбашукальнікі Амерыкі 2.
10.30, 0.55 Top Gear.
11.25 Што было далей?
13.15, 16.25, 6.05 Махінатары.
14.10, 3.55 Хуткія і гучныя.
15.05 Беар Грылс: выбрацца жывым.
16.00 Пятая перадача.
17.20, 3.05 Паляўнічыя на рэліквіі.
18.15 Будучыня з Джэймсам Вудсам.
19.10 Гіганцкія самалёты.
21.00 Гульня на жыццё.
23.00 Хлопцы з Юкана.
0.00 Кландай